УДК 821.161.3

**П. Р. Кошман** (Мазыр)

# АКТУАЛЬНАСЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СВЕТААДЧУВАННЯ Ў КНІЗЕ «РАДЗІВА “ПРУДОК”» А. ГОРВАТА

Сучасная беларуская літаратура, арыентаваная на рэпрэзентацыю нацыянальнага свету, для таго, каб захоўваць сваю значымасць для грамадства, мае неабходнасць адаптавацца да тых новых умоў, якія звязаны з развіццём камунікацыйных тэхналогій. Заўважным дасягненнем апошняга часу ў гэтым кірунку стала з'яўленне дзённіка А. Горвата «Радзіва “Прудок”».

Змест кнігі склалі аўтарскія запісы, якія першапачаткова прызначаліся для фэйсбуку, але змаглі выйсці за межы сяброўскага кола сацыяльнай сеткі. Перарывісты аповед сталічнага хіпстара пра перыпетыі свайго жыцця з прыхільнасцю быў сустрэты шырокай чытацкай публікай. Значная роля ў дасягненні гэтага прызнання, безумоўна, належыць сучасным камунікатыўным сродкам, дзякуючы якім А. Горват змог стаць сапраўды медыйнай персонай. Аднак ключавым фактарам папулярнасці дзённіка стала ўсё ж тое, што занатаваныя ў ім падзеі і рэфлексіі аказаліся надзвычай блізкімі для нашых сучаснікаў, уразілі іх незвычайным прыкладам самараскрыцця асобы ў звыклым антуражы сённяшняга жыцця.

Гісторыя Андруся Горвата, аўтара і галоўнага героя «Радзіва “Прудок”», пачынаецца ў Мінску з тых жыццёвых пазіцый, якія можна назваць тыповымі для нашага часу. Трыццацігадовы мінчук, які калісьці прыехаў за вышэйшай адукацыяй у сталіцу, працягвае шукаць сваё жыццёвае прызначэнне. Паводле ўласнага прызнання «фрэндам» у сацыяльнай сетцы, Андрусік Іванавіч адчувае страх паступова зліцца з агульнай людской масай, баіцца стаць праз наступныя дзесяць гадоў такім жа, як і яго сусед, «непатрэбным чалавекам». У імкненні знайсці сябе ў сталічнай рэчаіснасці, вылучыцца ў ёй герой робіць першы арыгінальны і, бясспрэчна, паспяховы з пункту гледжання прыцягнення ўвагі публікі ход: уладкоўваецца на працу ў Нацыянальны тэатр імя Янкі Купалы дворнікам. Разам з гэтай падзеяй у творы выбудоўваецца важны прынцып аўтарскага спасціжэння сучаснай беларускай рэчаіснасці праз судакрананне яе розных адзнак, аддаленых у нашай карціне свету адна ад адной.

Так, успрыманне Купалаўскага тэатру вачамі дворніка – гэта раскрыццё сімвала беларускай культуры ў яго будзённым існаванні. Горват не ўпускае моманту, каб падзівіцца з той сітуацыі, калі ў адным будынку вобразы высокай культуры сумяшчаюцца са звычайнымі жыццёвымі клопатамі. Аднак дзякуючы такому погляду акадэмічнае нацыянальнае мастацтва падаецца неад'емнай часткай беларускай рэчаіснасці, рэпрэзентуецца аўтарам як актуальная з'ява нацыянальнай культуры, якая выклікае цікавасць і мае прызнанне ў звычайных людзей.

У падобным святле праяўляюцца і іншыя атрыбуты-вобразы нацыянальнай культуры. Яны арганічна ўзнікаюць у плыні дзённікавых запісаў, ствараючы адчуванне далучанасці прыватнага жыцця сучаснага жыхара Беларусі да калек-

тыўнай спадчыны краіны. Пацалункі з Ганнай Чарнушкай у сне, убачанае на літаратурнай сустрэчы вуха пісьменніка Марціновіча, развагі адносна накладу дзіцячага часопіса «Вясёлка», першае слова па-беларуску, сказанае дачкой, – гэты шэраг смешных і сур'ёзных назіранняў дэманструе запатрабаванасць нацыянальных вобразаў у аўтарскім светаадчуванні і адначасова ўводзіць прыватны аповед яго дзённіка ў кантэкст традыцыі самавыяўлення беларускай нацыі.

Паступова ў запісах А. Горвата акрэсліваецца яшчэ больш незвычайная ідэя – вяртанне на радзіму свайго дзеда ў вёску Прудок, што каля Калінкавіч, або, як у аўтарскім тэксце, Каленкавічаў. Такі ўчынак, вельмі нетыповы для сучаснасці, выразна супрацьпастаўлены сённяшняй цэнтраімклівай тэндэнцыі, выклікаў вялікую ўвагу інтэрнэт-аўдыторыі. Урэшце, адной з прычын папулярнасці фэйсбукавых запісаў Горвата стала прадстаўленая ў іх магчымасць сачыць за своеасаблівым рэаліці-шоу, заснаваным на мясцовым беларускім матэрыяле. Герой-апавядальнік таксама падыгрывае такому фармату: у анлайн-рэжыме, у форме прамога эфіру з Прудка інфармуе пра свае апошнія прыгоды, а па сутнасці, пра эксперымент на выпрабаванне сілы духу і цела: «Радзіва "Прудок". Перадача "Апошні герой". Электраабагравальнік зламаўся, 3G-мадэм не працуе, малако не кісне. А ў каморы, дзе я сплю, плюс восем» [1, с. 38 ].

Разам з апісаннем цяжкасцей уладкавання вясковага побыту ў дзённіку з'яўляюцца назіранні за жыццём правінцыі, той часткі беларускай прасторы, якая, як лічыцца, найбольш захавала сувязь з традыцыяй. У адпаведнасці з запатрабаваннямі мэтавай аўдыторыі, зацікаўленай у відовішчах, вобраз вёскі Прудок раскрываецца найперш у шэрагу каларытных замалёвак вясковага жыцця. У жартоўных тонах аўтар паказвае сваё знаёмства з карэннымі жыхарамі, з іроніяй дэманструе свае поспехі ў развядзенні сельскай гаспадаркі, рэкламуе выгады жыцця на ўлонні прыроды. У штодзённых клопатах героя, яго адносінах да людзей, працы, навакольнага свету выяўляецца шэраг рыс, якія складаюць традыцыйную і ў цэлым пазітыўную ацэнку беларуса. З некаторым здзіўленнем аўтар адчувае ў сабе абуджэнне генаў беларускай цярплівасці, калі прыходзіцца палоць лён, і паляшуцкай сквапнасці, калі не можна спыніцца засаджваючы вясной агарод, з гумарам разважае аб сваёй залежнасці ад бульбы і сала. Усе гэтыя эпізоды развіваюць уяўленне аб прывязанасці беларуса да зямлі, яго працавітасці і падаюцца ў той характэрнай жартаўлівай манеры, якую дэманструе наступнае прызнанне: «Відаць, мяне ўкусіў нейкі шалёны беларус. От свята сёння, а я выю на столь, што няможна рабіць» [1, с. 208].

Актуальнасць кнізе «Радзіва "Прудок"» надае тое, што пляцоўкай горватаўскага эксперыменту стала вёска. Блізкасць яе вобраза бадай што для кожнага беларуса дазваляе чытачам супаставіць аўтарскія назіранні з уласным вопытам, адчуць ці ўспомніць далучанасць да сваёй родавай спадчыны. Вяртанне ў вёску выглядае своеасаблівым тэрапеўтычным сродкам для калектыўнай траўмы беларусаў, атрыманай пры масавым пераездзе ў горад. Не прыдуманы і не проста ўзяты з жыцця сюжэт, а менавіта перажываная аўтарам гісторыя наглядна раскрывае асаблівы статус малой радзімы ў свядомасці сучаснага беларуса і разам з тым прысутнасць дэкларатыўных адносін да яе. Больш тыповым для сённяшняга дня выглядае тое альтэрнатыўнае развіццё падзей, калі герой застаецца ў Мінску, а ва ўмоўным Прудку зносяць дзедава селішча. Аўтарскія разважанні даюць магчымасць адчуць тыя незваротныя духоўныя страты, якія нясуць беларусы пры рэалізацыі такога сцэнарыя: «Потым тут вырасла б кал-

гаснае жыта, і штогод на Радаўніцу мы, нашчадкі, гулялі б у гульню: тамака быў плот, тутака баба Дуся сядзела на лаўцы. Мы штогод гуляем у гэтую гульню на вотчыне маці» [1, с. 62].

Аднаўленне дзедавай хаты Андрусём Горватам бачыцца развіццём матыву вяртання радзімы, вядомага ў нацыянальнай літаратурнай традыцыі па вобразах роднай хаты ў Ф. Багушэвіча і раскіданага гнязда ў Я. Купалы. Адначасова з навядзеннем парадку на дзедавай сядзібе герой кнігі «Радзіва “Прудок”» узнаўляе гісторыю свайго роду, многія старонкі якой пазначаны агульнымі для ўсяго беларускага народа трагічнымі падзеямі. Лёс продкаў, якія перажылі ссылкі і выгнанні і здолелі вярнуцца на радзіму, выглядае ў сюжэце твора важнай эмацыянальнай падтрымкай самога героя-апавядальніка і, разам з тым, выяўленнем ментальнай сувязі розных пакаленняў беларусаў з роднай зямлёй.

Сюжэт «Радзіва “Прудок”» выяўляе складаную сітуацыю асабістага прызнання радзімы, бясспрэчна каштоўнай прасторы, але нярэдка складанай, нязручнай і для фізічнага, і для духоўнага быцця. Таму вяртанне Горвата на малую радзіму можа быць прызнана кімсьці як смелым, так і неабдуманым учынкам. Тым больш што сённяшні беларус мае магчымасць камунікаваць з усім светам, выбіраць для жыцця іншыя краіны. Герой кнігі таксама быў блізкі да такога рашэння, але стрымаўся, адчуваючы небяспеку страціць сваю беларускую адметнасць, сваю малую радзіму: «Я сам двойчы пачынаў пакаваць чамаданы. Але не з’ехаў, бо ў Польшчы ёсць усё, але няма хаты майго дзеда і яго магілы» [1, с. 181].

Такім чынам, кніга «Радзіва “Прудок”» дэманструе актуальнасць нацыянальнага ў пошуках сучасным беларусам свайго жыццёвага прызначэння. Прыналежнасць да беларускай культуры, клопат аб малой радзіме, цікавасць да менталітэту народа і яго гісторыі паўстаюць у дзённіку вызначальнымі характарыстыкамі асобы героя-апавядальніка і светапогляднай асновай яго адданасці Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Горват, А. І.* Радзіва «Прудок»: дзённік / А. І. Горват. – Мінск : Медысонт, 2018. – 246 с.